ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка”

Сектар маркетынгу, сацыякультурнай
дзейнасці і метадычнай работы

# Краязнаўчы календар Ашмяншчыны

## на 2025 год




Ашмяны, 2024

# *У 2025 годзе спаўняецца:*

## 745 гадоў
## з часу заснавання Гальшан (1280)




Першае ўпамінанне аб Гальшанах вядома з 1280 г. Да сярэдзіны ХУІ ст. ўладанне князёў Гальшанскіх, затым Сапегаў. З ХУ ст. існуе касцёл, з ХУІ ст. працавала праваслаўная царква (адноўлена пасля 1839 г.) і кальвінскі збор, пазней – уніяцкая царква.

У 1897 г. у вёсцы 2183 жыхары, у 1904 г. вёска (2032 жыхары, 602 дзесяціны зямлі) і маёнтак Ягміна (52 жыхары, 1236 дзесяцін зямлі). У 1920 г. працаваў валасны рэўком (старшыня В.Стрыеўскі). У ХІХ – пачатку ХХ ст. – цэнтр воласці, у 1920–1939 гг. і 1941–1944 гг. – цэнтр гміны. У 1940 г. быў створаны Гальшанскі сельсавет (12 населеных пунктаў, 2711 жыхароў). У 2-й палове ХІХ ст. існавала аднакласнае народнае вучылішча, у 1920 – 1939 гг. – сямігадовая школа, у 1939–1941 гг. – дзве няпоўныя сярэднія школы (беларуская і яўрэйская), у пасляваенныя гады – сярэдняя школа, школа пчалярства, заатэхнікум, спецшкола.

У Вялікую Айчынную вайну загінулі 13 жыхароў. Вызвалены 07.07.1944 г. войскамі 1-га стралковага батальёна 250-га стралковага палка 83-й гвардзейскай стралковай дывізіі 11-й гвардзейскай арміі.

У першыя пасляваенныя гады ў Гальшанах працавалі маслазавод, млын, электрастанцыя, дзве майстэрні, дзіцячы дом, у 1952 г. – вадзяны млын, лесазавод, ваўначоска, абозна-калёсны цэх, ганчарная і калодачная майстэрні, электрастанцыя, цагельны завод, паравы млын. У 1949 г. створаны калгасы “Ленінскі шлях”, “Світанак”, “Пераможца”. У 1950 г. створана Гальшанская МТС. У 1997 г. 480 двароў, 1230 жыхароў.

На 01.01.2024 г. 388 двароў, 993 жыхары. Працуюць аддзяленне сувязі, аддзяленне банкаўскіх паслуг, аптэка, амбулаторыя, дзіцячы сад,

бібліятэка, Дом культуры, сярэдняя школа, дзіцячая школа мастацтваў, 6 магазінаў, 3 кафэ, дом быта, 2 аграсядзібы, пажарны аварыйна-выратавальны пост, мехмайстэрня, 2 фермы; 14 вуліц і завулкаў.

Гальшаны – цэнтр сельсавета, у складзе камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства (КСУП) "Гальшаны".

Помнікі: касцёл, царква, руіны сярэдневяковага замка, гарадзішча і селішча XII–XIУ ст., паселішча XУI–XУIII ст., помнік землякам, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1.Корзун, Э.С. Гольшаны: По родному краю. – Мн. – Полымя, 1987 – 87 с.*

*2. Гальшаны: З гісторыі населеных рунктаў: Гальшанскі сельсавет // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 658.*

## 620 гадоў
## Соф'я Гальшанская (1405 – 1461)



Соф'я – сярэдняя дачка Андрэя Іванавіча, з роду Гальшанскіх, і Аляксандры Дзмітраўны, прадстаўніцы княжацкага роду Друцкіх, каралева польская, чацвёртая і апошняя жонка караля польскага Уладзіслава II Ягайлы. Шлюбная цырымонія Соф'і і Ягайлы праходзіла ў Навагрудку (1422). Соф'я Гальшанская адыграла не апошнюю ролю ў гісторыі не толькі Польскай Кароны і Вялікага княства Літоўскага, але і ў гісторыі Еўропы, паколькі лічыцца заснавальніцай дынастыі Ягелонаў. Яе сыны, Уладзіслаў Варненчык і Казімір Ягелончык, былі польскімі каралямі. Унукі, Ян Альбрэхт і Аляксандр Сігізмунд, падоўжылі іх дынастыю, а ўнук Уладзіслаў быў каралём венграў і чэхаў.

Каралева Соф'я пахавана ў капліцы Святой Тройцы вавельскага кафедральнага касцёла. Соф'і Гальшанскай польскі пісьменнік Юзэф

Крашэўскі прысвяціў гістарычную аповесць “Маці каралёў: часы Ягайлы”. Жыццёвыя факты Соф’і Гальшанскай ляглі ў аснову гістарычнага рамана беларускага пісьменніка Анатоля Бутэвіча “Каралева не здраджвала каралю”. Аб яе дзейнасці і ролі ў гісторыі польскай дзяржавы напісаны шматлікія манаграфіі і артыкулы.

На радзіме, у Гальшанах, устаноўлены помнік Соф’і Гальшанскай.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Корзун, Э. С. В те далекие времена (XIII – XVIII вв.): Первые владельцы (князья Гольшанские) / Э.С. Корзун // Гольшаны. – Мн. – Полымя, 1987 – С. 6-12.*
*2. Соф’я Гальшанская: Іх імёны ў гісторыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 72-74.*

## 520 гадоў
## Кляштар францысканцаў (1505)
## г.Ашмяны



Пабудаваны ў пачатку XVI ст. паводле ўказа польскага караля Аляксандра Ягелончыка, які пасяліў у Ашмянах манахаў-францысканцаў і падараваў ім Старыя Ашмяны (1505). Першапачаткова касцёл і манастыр былі драўлянымі, затым манахі ўласнымі сіламі збудавалі каменны. У 1655 г. касцёл пацярпеў ад іншаземцаў. У 1822 г. адбудаваны, у 1830 г. пераўтвораны ў склад. Апошні гвардыян (настаяцель) – ксёндз Твардоўскі. Сцены касцёла захаваліся (на Францішканскай вуліцы).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Касцёл францысканцаў: Культавае дойлідства // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 617-618.*

## 495 гадоў
## Волан (Волян) Андрэй (1530 – 1610)

Ідэолаг рэфармацыйнага руху на Беларусі і ў Літве, палітычны дзеяч, філосаф і правазнаўца, адзін з заснавальнікаў свецкага кірунку ў сацыяльна-

палітычнай думцы. Нарадзіўся ў Навагрудку. Служыў сакратаром у каралёў Рэчы Паспалітай Жыгімонта II Аўгуста, Стафана Баторыя, Жыгімонта III Вазы. Выбіраўся паслом у сейм Рэчы Паспалітай ад шляхты Ашмянскага павета. Меў маёнтак у Біюцішках, непадалёку ад Барун.

Аўтар палеміка-тэалагічных твораў, палітыка-прававых і філасофскіх трактатаў, прамоў (пераважна на лацінскай мове), у якіх абгрунтоўваў тэорыю натуральнага права, выступаў за роўнасць усіх саслоўяў перад законам, адстойваў прынцыпы верацярпімасці. Распрацаваў канцэпцыю свабоды чалавека (абарона маёмасці, асабістай бяспекі, усеагульнай згоды і міру ў грамадстве). Вядомы працы: "Пра палітычную або грамадзянскую свабоду"(1572), "Прамовы да сената…"(1572), "Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро" (1596), "Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці" (1608) і інш.

Памёр у 1610 г. Пахаваны ў в.Біюцішкі Ашмянскага раёна.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1.Волан (Волян) Андрэй: Іх імёны ў гісторыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 70.*

## 415 гадоў
## Гальшанскі замак (1610)



Гальшанскі мураваны замак будаваўся падчас княжання Паўла Стэфана Сапегі, які стаў уладальнікам Гальшан пасля шлюбу з князёўнай Аленай Гальшанскай. Узведзены не пазней 1610 г., ён з'яўляецца нагляднай ілюстрацыяй тых значных змен у архітэктуры, якія адбываліся на працягу стагоддзя. Сваёй кампазіцыяй ён аддалена нагадвае Мірскі замак і ўяўляе сабой прамавугольны (88,6 х 95,6 м) замкнуты будынак. Гальшанскі замак узводзіўся як жылёвы комплекс, хоць меў і

абарончае значэнне. Жылыя карпусы з вежамі на вуглах утвараюць замкнёны квадратны двор. Уязная брама размяшчалася па цэнтры аднаго з доўгіх фасадаў, які вызначаўся манументальнай прастатой. Арачны партал абрамляўся архівольтам. Даследчыкі адзначаюць тут рысы нідэрландскага рэнесансу: мэтай абароны служылі валы і роў, які запаўняўся вадой з ручая Карабель. Замак-палац у той час – гэта шыкоўная магнацкая рэзідэнцыя. Сцены былі аздоблены роспісамі, столі – ляпнінай, вокны – вітражамі, печы выкладзеныя гербавай кафляй.

Насупраць замкавай брамы, на процілеглым баку падворка знаходзілася невялікая каплічка, убудаваная ў жыллёвы корпус.

Ужо ў канцы XVII ст. Гальшанскі замак ад Сапегаў трапіў да іншых гаспадароў і на працягу стагоддзяў часта пераходзіў з рук у рукі. Падчас Паўночнай вайны замак быў разбураны шведамі і ўжо не здолеў поўнасцю аднавіцца. У 1880 г. уладальнік замка Гарбанёў пачаў узрываць вежы і сцены, а цэглу прадаваў на пабудову карчмы. Тым не менш, яшчэ перад другой сусветнай вайной у замку захаваліся каміны, роспіс, нават партрэт аднаго з Сапегаў.

Доўгі час пра былую веліч замка Сапегаў нагадвалі толькі рэшткі старадаўніх сцен і вежаў. Шмат таямніц замак забраў з сабой у нетры гісторыі. З Гальшанскім замкам звязана шмат легендаў і паданняў, якія ўвасабляюцца ў вобразах Дамы з Чорным манахам, Белай панны і іншых міфічных вобразаў. У. Караткевіч у сваім рамане “Чорны замак Альшанскі” паказаў многія фрагменты Гальшанскага замка, увасобіў гістарычных асоб, уладальнікаў замкавага палаца.

Гальшанскі замак – гісторыка-архітэктурны аб’ект рэспубліканскага значэння, занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. У 2010 г. пачалася кансервацыя будынкаў, а ў 2017 г. – рэстаўрацыя. За сродкі з Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва адноўлена паўночная вежа замка, добраўпарадкавана тэрыторыя. У 2021 г. Гальшанскі замак афіцыйна расчыніў свае дзверы для турыстаў. Па стане на 2024 г. практычна цалкам завершана кансервацыя прылеглых да вежы сцен.

З 2009 г. у замку штогод праходзіць рэспубліканскі фэст “Гальшанскі замак”, на які з’язджаюцца госці з усёй Беларусі.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Гальшанскі замак: Аб маёнтках Ашмяншчыны і іх уладальніках // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 608-609.*

*2. Гольшанский замок. – Режим доступа:*
*https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%93%D0%BE%D0%BB%D1%8C%D1%88%D0%B0%D0%BD%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D0%B7%D0%B0%D0%BC%D0%BE%D0%BA*

## 325 гадоў
## Барунская базыльянская школа (1700)



У 1700 г. у в.Баруны з мястэчка Вішнева была пераведзена павятовая школа свецкага накірунку з 3-гадовым курсам навучання. У 1740 г. пераўтворана ў навучальную ўстанову для падрыхтоўкі кандыдатаў у духоўнае званне, стала адным з буйнейшых базыльянскіх цэнтраў на Беларусі ў ХУІІ – 1-й трэці ХІХ ст. У 1780 г. зноў стала свецкай навучальнай установай – 6-гадовай гімназіяй. Гімназія была закрытага тыпу, першапачаткова настаўнічалі вучоныя манахі, з ХІХ ст. пачалі з’яўляцца і свецкія настаўнікі. Навучанне вялося на польскай мове, вывучаліся таксама лацінская, французская, нямецкая, руская (з 1800) мовы. У 1800 г. навучалася больш за 100 чалавек.

У 1788–1808 гг. для гімназіі пабудаваны мураваны манастырскі корпус, у якім размясціліся класы, памяшканні для манахаў, кватэры для настаўнікаў. Барунская базыльянская школа славілася вялікай колькасцю сваіх вучняў, што потым буйнымі літарамі ўпісалі свае імёны ў сусветную гісторыю. Сярод іх пісьменнікі і літаратары Антон Эдвард Адынец, Юльян Корсак, Леанард і Ігнацы Ходзькі, прафесар матэматыкі Віленскага ўніверсітэта Антоні Вырвіч, ад’юнкт прафесара астраноміі Вінцэнт Карчэўскі, аўтар прац па асновах геаграфіі і арыфметыкі Антоні Камінскі і іншыя.

У 1831 г. была прынята пастанова аб скасаванні базыльянскай свецкай школы ў Барунах і стварэнні замест яе духоўнай школы, абавязанай даваць выхаванне 20 сіротам ці дзецям беднага духавенства.

У далейшым у будынку школы яшчэ не аднойчы адбывалася змена навучальных устаноў.

Корпус базыльянскай школы захаваўся да нашага часу, у адным з яго памяшканняў да 2010 г. працаваў сельскі Дом культуры, у 60-я–70-я гады XX ст. размяшчалася сельская бібліятэка.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Барунская базыльянская школа і яе выхаванцы: Ад часоў першабытных – 1917 // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 110-116.*
*2. Беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах (1920–1922) // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 209-210.*

## 235 гадоў
## Касцёл Найсвяцейшага імя Марыі (1790)
## в.Мураваная Ашмянка



Знаходзіцца ў цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 1790 г. з дрэва па фундацыі падкаморыя Ігната Важынскага на месцы касцёла 1650 г. Паднаўляўся ў 1841 г. і 1874 г. У межах агароджанага касцельнага сквера адасоблена стаіць 2-ярусная каркасная званіца этнаграфічнай трактоўкі. Касцёл дзейнічае. Пабудаваны ў традыцыях народнага драўлянага дойлідства.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Касцёл Найсвяцейшага імя Марыі: в.Мураваная Ашмянка: Культавае дойлідства // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 615-616.*

## 215 гадоў
## Капліца (1810) в. Паляны



Драўляная капліца пад тытулам Святой Ганны на мясцовых могілках у вёсцы Паляны пабудавана ў 1810 г. з фундацыі Амброзія Янкоўскага. У 1991 г. адрамантавана вернікамі з дапамогай калгаса "Маяк" (старшыня І.І.Гіруць). Рамонтныя работы праводзіліся пад кіраўніцтвам С.Б.Сінюковіча (майстар). Ініцыятар рамонту З.Заянчкоўская (памерла). У 2017 г. здзейснена замена фундаменту, у 2019 г. асвечана біскупам Гродзенскай дыяцэзіі Юзафам Станеўскім.

Помнік народнага дойлідства з рысамі класіцызму. Вырашана прамавугольным у плане зрубам пад двухсхільным дахам, вынесеным на фасадзе трохвугольным франтонам на чатырох слупах, у самым левым інтэркалумніі якога падвешаны звон. Вертыкальна ашаляваныя фасады прарэзаны высока ўзнятымі прамавугольнымі аконнымі і ўваходным праёмамі, паўкруглай люкарнай пад франтонам.

Інтэр'ер перакрыты плоскай падшыўной столлю, падлога цагляная, над уваходам хоры на двух слупах.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Капліца: в.Паляны: Культавае дойлідства // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.].–Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.616.*

*2. Капліца Святой Ганны (Паляны). – Рэжым доступу:* [https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%9A%D0%B0%D0%BF%D0%BB%D1%96%D1%86%D0%B0_%D0%A1%D0%B2%D1%8F%D1%82%D0%BE%D0%B9_%D0%93%D0%B0%D0%BD%D0%BD%D1%8B_(%D0%9F%D0%B0%D0%BB%D1%8F%D0%BD%D1%8B)](https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%9A%D0%B0%D0%BF%D0%BB%D1%96%D1%86%D0%B0_%D0%A1%D0%B2%D1%8F%D1%82%D0%BE%D0%B9_%D0%93%D0%B0%D0%BD%D0%BD%D1%8B_(%D0%9F%D0%B0%D0%BB%D1%8F%D0%BD%D1%8B))

## 185 гадоў
## Мінейка Зыгмунт (1840 – 1925)



Беларускі, польскі, грэчаскі грамадскі дзеяч, этнограф, калекцыянер, мемуарыст. Мінейка-Газдава Сігізмунд Станіслававіч нарадзіўся ў в.Балванішкі Ашмянскага раёна ў 1840 г. Са шляхецкай сям'і. Закончыў Віленскую гімназію. Вучыўся ў Пецярбургскай ваенна-інжынернай школе. Удзельнічаў у вызваленчым руху на Віленшчыне. Знаходзіўся ў эміграцыі, вучыўся ў Італіі ў ваеннай школе. З 1861 г. на радзіме. З 1865 г. у Францыі. Закончыў ў Парыжы Акадэмію Генштаба (1868). У Балгарыі, Турцыі, Грэцыі праектаваў чыгункі, масты, вёў археалагічныя даследаванні. З 1891 г. жыў у Грэцыі, кіраваў дэпартаментам Міністэрства грамадскіх работ. У час вайны за вызваленне Крыта ўзначаліў тапаграфічны аддзел Генштаба. Неацэнныя заслугі належаць яму ў арганізацыі і ўзяцці грэчаскімі войскамі турэцкай крэпасці Яніна, што і стала адной з важнейшых перамог. Напэўна, якраз гэты факт адыграў рашаючую ролю ў пастанове парламента аб прысваенні Мінейку звання ганаровага грамадзяніна Грэцыі. У 1880 г. ён ажаніўся на грачанцы Персефоне Манары, якая нарадзіла яму сямёра дзяцей. Адна з яго дачок выйшла замуж за Георгіаса Папандрэу – вядомага палітыка Грэцыі, пачынальніка вялікай палітычнай дынастыі.

На радзіме пабываў ў 1911 г. і ў пачатку 1920-х гадоў, перадаў Віленскаму ўніверсітэту калекцыю старажытных манет. Напісаў мемуары (больш за 40 тамоў), частка выдадзена ў 1971 г. Памёр у 1925 г., пахаваны ў Афінах.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Мінейка Зыгмунт: Іх імёны ў гісторыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.].–Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.141-142.*

## 150 гадоў
## Касцёл Святых апосталаў Пятра і Паўла (1875)
## в.Жупраны



Пабудаваны ў 1854–1875 гг. з цэглы. Знаходзіцца ў цэнтры вёскі. Будаўніцтва касцёла пачалося пры графе Адаме Чапскім, якому ў той час належалі Жупраны. Помнік архітэктуры рэтраготыкі. Прамавугольны ў плане 3-нефавы храм накрыты 2-схільным дахам, з франтальнага фасада далучана вежа-званіца. Маляўнічасць храму надаюць вялікія фасадныя плоскасці з аконнымі праёмамі, блендамі і нішамі. У інтэр'еры 6 магутных гранёных слупоў падзяляюць залу на 3 нефы, сярод якіх самы вялікі цэнтральны, завершаны ў апсідзе алтаром. Касцельнае начынне выканана пераважна ў рэтраспектыўна-барочным стылі. Над уваходам на трайную аркаду ўзнесены па-барочнаму хвалістыя хоры з невялікім арганам.

Злева ад увахода размешчана белая мармуровая мемарыяльная пліта з надпісам: "Францішку Багушэвічу, 1840–1900, прыяцелі", як знак ушанавання памяці аб знакамітым земляку. Паводле слоў мясцовых жыхароў Францішак Багушэвіч дапамагаў будаваць Жупранскі касцёл, ён ездзіў па фэстах і збіраў грошы на будоўлю.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Касцёл Святых Апосталаў Пятра і Паўла: в.Жупраны: Культавае дойлідства // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 615.*

## 135 гадоў
## Дзяржаўная ўстанова адукацыі
## "Мураванаашмянкоўская сярэдняя школа" (1890)



У 1890 г. у в.Мураваная Ашмянка ўжо працавала народнае вучылішча, у якім настаўнічаў Захар Грыб. У 1921 г. адкрылася польская сямігадовая школа. У 1939 – 1941 гг. існавала беларуская няпоўная сярэдняя школа. Сваю дзейнасць яна аднавіла ў пасляваенны час, з 1952 г. працуе як сярэдняя. Сучасны тыпавы будынак школы здадзены ў эксплуатацыю ў 1971 г. У 2009 г. за спонсарскія сродкі абсталявана трэнажорная зала. У 2003 г. адкрыты музей-майстэрня мяккай цацкі. У 2020 г. – музей цацкі "Царства цацак". У музеі выстаўлена каля 200 экспанатаў, распрацаваны тэматычныя экскурсіі.

У пасляваенныя гады на пасадзе дырэктара працавалі: З.А.Сошнеў, М.М.Пузіноўскі, А.А.Канановіч, М.І.Касяк, І.І.Германчук, І.М.Кірышчэнка, А.З.Вішнеўскі, Г.І.Швабовіч, М.Ю.Ціхамірава, з 2012 г. – Л.У.Сульжыцкая. Усё жыццё прысвяцілі выхаванню моладзі педагогі Е.У.Пяткевіч, Н.М.Сафронава, А.Г.Матусевіч, Ж.М.Кірышчэнка, Дз.М.Матусевіч. У 2002 г. у школе 133 вучні, 32 настаўнікі. Сярод выпускнікоў кандыдаты навук Г.Г.Радзівонаў і А.П.Гайдукевіч.

У пасляваенны час школа зрабіла 63 выпускі. З 1 верасня 2007 г. створана Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Мураванаашмянкоўскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі–сад–сярэдняя школа". З 1 верасня 2022 г. перайменавана ў Дзяржаўную ўстанову адукацыіі "Мураванаашмянкоўская сярэдняя школа". У 2010 г. вучылася 170 школьнікаў. У 2023/2024 навучальным годзе – 73 навучэнцы, з іх 16 дашкольнікаў, працуе 26 настаўнікаў і выхавальнікаў.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Мураванаашмянкоўская сярэдняя школа: З гісторыі школ і ўстаноў адукацыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 542-543*

.

## 125 гадоў
## Адкрытае акцыянернае таварыства
## “Ашмянскі мясакамбінат” (1900)



У 1900 г. у Ашмянах пачалося будаўніцтва гарадской бойні. У сярэдзіне 1920-х гг. дырэктарам з’яўляўся ветэрынарны ўрач К.Руткоўскі, у 1936 г. бойня рэканструявана. У 1940 г. тут пра-цавалі 22 рабочыя. У гады Вялікай Айчыннай вайны работа бойні была прыпынена. З 1.10.1945 г. працуе як мясакамбінат. Некалькі разоў пераўтвараўся ў бойню Маладзечанскага і Мінскага мясакамбінатаў. Са жніўня 1954 г. прадпрыемства стала называцца птушкакамбінатам. З 1967 г. – зноў Ашмянскі мясакамбінат. На працягу 1971–1991 гг. з’яўлялася філіялам Лідскага мясакамбіната. З 1991 г. – Ашмянскі мясакамбінат. У 1995 г. становіцца адкрытым акцыянерным таварыствам “Ашмянскі мясакамбінат”.

Сёння ААТ “Ашмянскі мясакамбінат” у ліку самых сучасных і тэхнічна асначаных прадпрыемстваў мясамалочнай галіны. На сённяшні дзень мясакамбінат вырабляе і прапануе для рэалізацыі больш за 200 відаў прадукцыі. Гэта каўбасныя вырабы, паўфабрыкаты, мяса свініны і ялавічыны. Прадстаўлены розныя віды вакуумнай і газавай ўпакоўкі, фасоўка.

На ААТ “Ашмянскі мясакамбінат” створана сетка фірменных магазінаў, якая складаецца з 27 аб'ектаў гандлю. Сетка фірменных магазінаў пад гандлёвай маркай “Пачастунак” карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод пакупнікоў. Яна прадстаўлена ў гарадах: Ашмяны, Гродна, Смаргонь, Астравец, Ліда, Іўе, Шчучын, Наваельня.

У пасляваенны час дырэктарамі мясакамбіната (забойнага цэха, філіяла) працавалі Ф.П.Ваяводаў, Н.Ч.Бараноўскі, С.Х.Вайнер, І.М.Салохін, І.І.Куляшоў, А.І.Дзмітровіч, Г.А.Радзівонаў, М.Л.Гунько, А.І.Бабушкіна, М.Ц.Дзюмін, П.М.Папоў, М.М.Калядка, А.І.Мазікаў, А.М.Касцюкоў, І.У.Лупіш. На працягу 38 год (1977–2015) прадпрыемства ўзначальвала Т.У.Філіповіч. Са жніўня 2021 г. – дырэктар Ю.А.Драмлюк.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Адкрытае акцыянерное таварыства "Ашмянскі мясакамбінат": Прадпрыемствы, арганізацыі, установы // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 502.*
*2. ОАО «Ошмянский мясокомбинат». – Режим доступа:*
https://www.oshmiany.gov.by/ru/myasokombinat-ru/

## 85 гадоў
## Ашмянская раённая бібліятэка (1940)




Гісторыя бібліятэкі пачынаецца з 1940 г., калі быў утвораны Ашмянскі раён. Да 1939 г. на тэрыторыі сучаснага Ашмянскага раёна была адна бібліятэка з кніжным фондам 2 тыс. экз. кніг. Карыстанне бібліятэкай было платным. Колькасць чытачоў нязначная: чыноўнікі, купцы, гандляры і іх дзеці. З 1940 г. бібліятэка ў г.Ашмяны выконвае функцыю раённай. Загадчык бібліятэкі – Х.Жупранер. У сельскай мясцовасці працавала 12 хат-чытальняў, існавалі перасоўкі-бібліятэчкі ў райбальніцы, дзіцячым доме, сельскагаспадарчай школе. Налічвалася 1945 экз. рускай, 1200 - беларускай, 725 – яўрэйскай, 350 – польскай літаратуры і абслугоўвалася 850 чытачоў.

За гады нямецка-фашысцкай акупацыі фонд бібліятэкі быў поўнасцю знішчаны. У 1944 г. раённая бібліятэка аднавіла сваю дзейнасць, загадчыкам стаў Рыбкін Юрый Міхайлавіч. За кошт бюджэту была набыта невялікая колькасць кніг. Акрамя гэтага, бібліятэцы ў дар былі дасланы кнігі з бібліятэк гарадоў Горкага і Куйбышава. У 1948 г. фонд бібліятэкі складаў 2421 экз.

18 ліпеня 1949 г. у горадзе адкрыта гарадская бібліятэка. Пачалі дзейнічаць сельскія і раённая дзіцячая бібліятэка. У 1957 г. раённай бібліятэцы ўручаны дыплом Міністэрства культуры БССР "Лепшая раённая бібліятэка БССР".

У 1976 г. у раёне адбылася цэнтралізацыя бібліятэчных устаноў. Усе бібліятэкі аб’ядналіся ў раённую цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму (РЦБС), у якую ўвайшлі 42 бібліятэкі: раённая цэнтральная, раённая дзіцячая, 40 бібліятэк\філіялаў у горадзе і на сяле.

Па выніках работы за 2004 г. Ашмянская РЦБ узнагароджана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – за дасягненні ў вобласці інфармацыйнага абслугоўвання і прававой адукацыі насельніцтва. У 2010 г. РЦБС налічвала 23 бібліятэкі: РЦБ, РДБ, 2 ГБ, 19 сельскіх.

На 01.01.2015 г. Ашмянская РЦБС аб’ядноўвала 18 бібліятэк, з іх 4 у горадзе і 14 на сяле. На 01.01.2020 г. – 16 бібліятэк: 3 гарадскіх, 13 сельскіх.

У 2015 г. раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма рэарганізавана ў ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка”, у склад якой увайшлі 16 бібліятэк: 3 у горадзе і 13 на сяле . З 2011 г. ад раённай бібліятэкі працуе бібліёбус, які займаецца абслугоўваннем жыхароў аддаленых населеных пунктаў раёна. Стацыянарнае абслугоўванне чытачоў раённай бібліятэкі з 2007 г. вядзецца ў аўтаматызаваным рэжыме ў праграме ALIS WEB.

У 2020 г. раённая бібліятэка пераведзена ў іншы будынак з больш прыставанымі умовамі для працы. У 2021 г. да раённай бібліятэкі далучана раённая дзіцячая бібліятэка, утвораны аддзел па абслугоўванні дзіцячага чытача.

На канец 2024 г. ДУК “Ашмянская раённая бібліятэка” аб’ядноўвае 13 бібліятэк: з іх 12 знаходзіцца ў сельскай мясцовасці. У раённай бібліятэцы налічваецца 36 камп’ютараў (усяго па раёну 57). Пры бібліятэцы створаны аматарскія аб’яднанні “Мудрасць +” і “Лялечны карагод” (для дзяцей); публічны цэнтр прававой інфармацыі (ПЦПІ) (2001). Усяго ў бібліятэках раёна працуе 39 бібліятэчных работнікаў, у т.л. у раённай бібліятэцы – 24.

У розны час раённую бібліятэку ўзначальвалі К.А.Іванова, В.Дз.Дабраўляніна, Г.М.Каляда, А.Р.Каско, з 2003 г. М.Р.Белавус.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Ашмянская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма: Прадпрыемствы, арганізацыі, установы // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 508-509.*
*2. Дзяржаўная ўстанова культуры “Ашмянская раённая бібліятэка”. – Рэжым доступу: https://library.kultoshm.by/*

## 60 гадоў
## “Вытворчы ўчастак “Ашмянскі” у складзе ААТ “Торфабрыкетны завод Лідскі” (1965)



У 1965 г. праектным інстытутам “Белгіпраторф” была распрацавана дакументацыя на будаўніцтва торфабрыкетнага завода (праект зацверджаны Саветам Міністраў БССР 7.10.1965), які пачаў узводзіцца на базе радовішча торфу, разведанага ў 1955 г. горкаўскімі і ленінградскімі геолагамі. Завод пабудаваны ў 1968 г. (вытворчая магутнасць 60 тыс. т паліўных брыкетаў у год).

Торфараспрацоўкі ў раёне вяліся з чэрвеня 1940 г. каля вёсак Бернікі і Гродзі. У чэрвені 1946 г. здабыча торфу аднавілася. Работы праводзіліся ўручную. Арганізацыя спачатку мела назву “Торфапрадпрыемства ў Берніках” і ўваходзіла ў Міністэрства паліўнай прамысловасці БССР. У 1948 г. атрымала афіцыйную назву “Торфапрадпрыемства “Бернікі”. Існавала як самастойная адзінка, у апошнія гады перад будаўніцтвам торфабрыкетнага завода, было далучана як участак да галоўнага прадпрыемства “Валейкавічы” Смаргонскага раёна.

У 1968 г. колькасць рабочых і служачых – 250 чалавек. У 2000 г. торфабрыкетны завод перайменаваны ў рэспубліканскае ўнітарнае торфапрадпрыемства.

У 2009 г. ААТ “Торфабрыкетны завод Ашмянскі” – дзяржаўнае прадпрыемства рэспубліканскай уласнасці ў складзе дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліву і газіфікацыі “Белпалівагаз” Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь. У 2015 г. на прадпрыемстве працавала 89 чалавек, выпускалася 9115,4 т паліўнай прадукцыі. Асноўны від дзейнасці – здабыча фрэзернага торфу. З 28.08.2019 г. – “Вытворчы ўчастак “Ашмянскі” у складзе ААТ “Торфабрыкетны завод Лідскі”, займаецца здабычай фрэзернага торфу. Працуюць 35 чалавек.

У розны час калектыў узначальвалі: Спірыдовіч, І.Лазараў, Б.Аскерка, А.Патапенка, В.Гаўрыкаў, С.Шамрай, І.Ляшэнка, І.Буй, М.Бялянскі, Г.Барысевіч, І.Снітко, В.Есьман, С.Алешка, В.Краўчанка, І.Каханоўскі, М.Ламака, М.Харашаеў, В.Дэбесь, А.Кіркоўскі, А.Зінкевіч, С.Верушкоў,

В.Хіневіч, К.Гудэбскі, А.Ганчарык, Т.Лыскойць, А.Казмерчук, з 2020 г. К.Маліноўская.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1.Вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае торфапрадпрыемства "Ашмянскае": Прадпрыемствы, арганізацыі, установы // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 514-515.*
*2. ОАО «Торфобрикетный завод Лидский». – Режим доступа: https://lida-tbz.by/about/*

## 60 гадоў
## Філіял "Ашмянскія электрычныя сеткі" РУП "Гроднаэнерга" (1965)



15.05.1965 г. загадам № 68 РЭУ "Гроднаэнерга" быў утвораны Ашмянскі раён электрычных сетак, у склад якога ўвайшлі Ашмянскі, Смаргонскі, Астравецкі ўчасткі электрасетак.

Да 1957 г. раён выкарыстоўваў выключна электраэнергію, якую выпрацоўвалі мясцовыя электрастанцыі. З будаўніцтвам падстанцый і паветраных ліній электраперадач раён стаў атрымліваць электраэнергію і з абласнога цэнтра Маладзечна. 30.10.1958 г. уступіла ў строй падстанцыя на 35 кВ у Ашмянах. У сакавіку 1959 г. пачалася электрыфікацыя калгасаў і саўгасаў. На базе былых электрастанцый утвараецца Ашмянскі ўчастак электрасетак.

13.12.1967 г. Ашмянскі РЭС быў перайменаваны ў Ашмянскае прадпрыемства электрычных сетак (ПЭС). 01.02. 1970 г. у склад Ашмянскага ПЭС быў уключаны Іўеўскі РЭС. У Ашмянскае ПЭС уваходзіла 8 падстанцый на 35 кВ, 3 – на 110 кВ. У 1978 г. пабудавана тыпавая база ПЭС.

У лістападзе 1988 г. прадпрыемства электрасетак перайменавана ў Ашмянскія электрасеткі (АЭС). У 80-90-я гады Ашмянскія ЭС у многіх вытворчых пытаннях былі першымі ў Гродзенскай энергасістэме: у будаўніцтве гаспадарчым спосабам дыспетчарскіх пунктаў АДС, ва

ўкараненні цэнтралізаванага рамонту КТП, вырабе механізмаў для чысткі прасек і металаканструкцый для ВЛ-0,4/10 кВ, у тэмпах замены КТП на СТП.

31.12.1999 г. Ашмянскае прадпрыемства электрычных сетак пераўтворана ў філіял “Ашмянскія электрычныя сеткі” РУП “Гроднаэнерга”. У 2001 г. на прадпрыемстве працавала 640 чалавек, у т. л. 90 непасрэдна ў Ашмянскім раёне электрасетак. У 2019 г. у эксплуатацыі знаходзяцца 40 падстанцый 35-330 кВ з агульнай устаноўленай магутнасцю 739 МВА.

Сёння ў склад філіяла ўваходзяць пяць раёнаў электрычных сетак: Ашмянскі, Смаргонскі, Астравецкі, Іўеўскі, Высакавольтны РЭС. Галоўная задача прадпрыемства – якаснае і надзейнае электразабеспячэнне спажыўца. Распрацаваны доўгатэрміновы план па рэканструкцыі электрычных сетак да жылфонду, у якім прадугледжваецца выкарыстанне электраэнергіі для ацяплення на 2021-2025 гг. Колькасць персаналу філіяла – 678 чалавек (на 31.12.2023).

Прадпрыемства электрасетак узначальвалі дырэктары: М. І. Зык, А. А. Лявошка, М. М. Цішкевіч, Ф.В.Ждановіч, М.С.Жур, з 2023 г. – І.У.Удалой. Ашмянскі ўчастак і Ашмянскі РЭС узначальвалі: В.С.Гусь, В.М.Грамыка, К.С.Астравух, В.С.Багумінскі, В.К.Бяляцкі, Р.М.Бельскі, А.К.Каско, У.І.Верамеевіч, з 2019 г. – А.С.Барткевіч.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Ашмянскія электрасеткі: Прадпрыемствы, арганізацыі, установы // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 510-511.*

*2. Игорь Удалой: «За большими и малыми достижениями предприятия всегда стоят люди». – Режим доступа: https://www.osh.by/?p=102794*

*3. Ошмянские электрические сети: про перспективу, достижения и киловатты. – Режим доступа:* https://grodnonews.by/news/ekonomika/oshmyanskie_elektricheskie_seti_rabotaem_na_perspektivu_stremimsya_k_sovershenstvu.html

## 55 гадоў
## Дзяржаўная ўстанова адукацыі
## “Кальчунская сярэдняя школа” (1970)



У пачатку ХХ ст. працавалі пачатковыя школы ў вёсках Дэбесі (зараз Кальчуны) і Гароднікі ( у Гародніках школа спачатку размяшчалася ў хаце Віктара Андрыеўскага, а ў 1918 г. для яе было пабудавана спецыяльнае памяшканне). Пачатковымі яны заставаліся ў час знаходжання краю ў складзе Польшчы і ў 1939 – 1941 гг.

У пасляваенны час школа ў Дэбесях заставалася пачатковай і неўзабаве была закрыта. Гародніцкая школа стала сямігадовай, васьмігадовай, базавай. У 1970 г. школа перамясцілася ў в.Кальчуны і ў 1988 г. стала сярэдняй. Кальчунская СШ у 1990 – 2009 гг. зрабіла 19 выпускаў. Сярод выпускнікоў выкладчык інстытута К.Кавалеўская, ваенны лётчык-выпрабавальнік Л.І.Восіпаў і інш. У 2024/2025 навучальным годзе ў школе займаецца 132 вучні, працуюць 20 выкладчыкаў. Дырэктарамі школы пасля 1970 г. працавалі А.С.Харко, М.У.Данілковіч, В.Ф.Іваноў, Э.А.Баркоўскі, А.П.Шмукста, з 2015 г. Я.С.Навіцкі.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Кальчунская сярэдняя школа: З гісторыі школ і ўстаноў адукацыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С. 541-542.*
*2. Государственное учреждение образования «Кольчунская средняя школа». – Режим доступа: http://kolchuny.oshobr.by/*

## *Студзень*

### 100 гадоў
### Басько Іван Кузьміч (1925 – 2014)



Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Ганаровы грамадзянін г.Ашмяны. Нарадзіўся 01.01.1925г. у в.Заберазь Іўеўскага раёна, у сялянскай сям’і. У 1939 г. закончыў 7 класаў. У 1943 г. стаў сувязным партызанскага атрада, у снежні 1943 г. быў залічаны ў партызанскі атрад «Белорусский мститель» брыгады

«Вперед». Удзельнічаў у разгроме нямецкіх гарнізонаў у вёсках Кочава, Ізабеліны, Луганавічы, у рэйкавай вайне перад пачаткам аперацыі «Багратион». Пад Беластокам у ліпені 1944 г. залічаны ў 2-гі Беларускі фронт, 5-ю Арлоўскую дывізію, у 336 стралковы полк, радавым кулямётчыкам. Пад в. Вішнеўка 19 жніўня 1944 г. быў паранены. У 1944 г. накіраваны на перадавую, на 2-гі Беларускі фронт разведчыкам-назіральнікам у 5-ю мінамётную брыгаду, у 2-ю артылерыйскую дывізію РГК у раёне Данцыгскага калідора. У лютым 1945 г. зноў ранены. У 1945 г. – разведчык-назіральнік у 48-й гвардейскай цяжка-гаўбічнай артылерыйскай брыгадзе, тут прысвоена званне гвардейца. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі «За отвагу», «За взятие Берлина», «За Победу в Великой Отечественной войне 1941-1945», «За взятие Варшавы», «За взятие Кенигсберга».

Пасля вайны застаўся ў радах Савецкай Арміі. У 1952 г. быў прыняты ў члены партыі КПСС. У жніўні 1953 г. звolены ў запас у званні старшыны.

У 1960 г. пераехаў у Ашмянскі раён. Працаваў на кіруючых пасадах у галіне сельскай гаспадаркі. У 1966 г. узнагароджаны ордэнам «Знак почета», у 1973 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1995 г. пайшоў на заслужаны адпачынак. З’яўляўся кіраўніком ветэранскай арганізацыі СВК імя Багушэвіча. Званне “Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны” прысвоена ў 2009 г. Памёр 26.06.2014 г.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Басько Іван Кузьміч: Вярнуліся пераможцамі // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.407.*
*2. Бoсько Иван Кузьмич: Почетные граждане. – Режим доступа:* https://oshmiany.gov.by/ru/pochetnye-grajdane-ru/

## 95 гадоў
## Козел Валянціна Нічыпараўна (1930 – 2009)



Педагог, Заслужаны настаўнік Беларусі, ардэнаносец. Нарадзілася 06.01.1930 г. у в. Цяраспаль Слуцкага раёна. Закончыла Слуцкае педагагічнае вучылішча (1952). Да 1969 г. працавала ў школах Астравецкага раёна, з 1969 г. – у Гродзіеўскай школе (васьмігадовая, няпоўная сярэдняя, базавая) Ашмянскага раёна. Ганаровае званне “Заслужаны настаўнік” прысвоена ў 1966 г. Узнагароджана ордэнам “Знак пашаны” (1978), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1966), медалямі. Памерла 27.08.2009 г.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Козел (Ісаевіч) Валянціна Нічыпараўна: Заслужаны настаўнік: Вызначыліся працай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.562.*

## 130 гадоў
## Гольдберг Бен Цыён (1895 – 1972)



Яўрэйскі журналіст, псіхолаг. Нарадзіўся 09.01.1895 г. у мястэчку Гальшаны Ашмянскага раёна. Доктар псіхалогіі (1921). Нарадзіўся ў 1895 г. ў мястэчку Гальшаны Ашмянскага раёна. Пісаў на ідыш і англійскай мове. Вучыўся ў ешыботах Ліды і Валожына. Браў прыватныя ўрокі. У 1907 г. выехаў з бацькамі ў ЗША. У 1920 г. закончыў аддзяленне псіхалогіі Калумбійскага ўніверсітэта. З 1922 г. супрацоўнік, у 1924 – 1940 гг. рэдактар газеты “Дэр тог”. Адзін са стваральнікаў таварыства “Аб’яднанне культур з мовай ідыш” (1937). Яго прасавецкія рэпартажы аб наведванні СССР (1934) выклікалі палеміку ў яўрэйскай прэсе ЗША. У час вайны – сябра Амерыканскага камітэта яўрэйскіх пісьменнікаў, мастакоў і вучоных і яўрэйскага савета па дапамозе СССР у вайне. Узначальваў Нацыянальны яўрэйскі камітэт амерыкана-савецкай дружбы. Пасля вайны жыў у Ізраілі. Выдаў кнігі “Яўрэйская праблема ў СССР” (1961), “Падарожжа па СССР” (1966).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Гольдберг Бен Цыён: Іх імёны ў гісторыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.139.*

## 70 гадоў
## Гружэўскі Міхаіл Мар'янавіч (1955-2018)



Педагог, грамадскі дзеяч, Заслужаны настаўнік Беларусі (2002), Ганаровы грамадзянін г.Ашмяны (2016). Нарадзіўся 13.01.1955 г. у в.Каменка Ашмянскага раёна. Закончыў Каменскую васьмігадовую школу (1970), Ашмянскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1973), гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1981). Працоўную дзейнасць пачаў у калгасе "Шлях Леніна" Іўеўскага раёна дыспетчарам (1973), служыў у пагранічных войсках (1973 – 1975). Працаваў выкладчыкам пачатковай ваеннай падрыхтоўкі (1975 – 1984), намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце (1984 – 1986) у СШ №2 г.Ашмяны. У 1986 – 1987 гг. інспектар раённага аддзела адукацыі. З 1987 г. па 2018 г. – дырэктар СШ №1 г. Ашмяны. Пад яго кіраўніцтвам СШ №1 дасягнула вялікіх поспехаў.

У 2011 г. узнагароджаны ордэнам Ф.Скарыны, у 2014 г. Граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дэпутат Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 25 – 27 скліканняў. Памёр 22.09.2018 г. Яго імя прысвоена сярэдняй школе №1 г.Ашмяны (2019).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Гружэўскі Міхаіл Мар'янавіч: Заслужаны настаўнік: Вызначыліся працай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.561.*
*2. Гружевский Михаил Марьянович: Почетные граждане. – Режим доступа: /https://oshmiany.gov.by/ru/pochetnye-grajdane-ru/*
*3. Режим доступа: https://osh1.schools.by/teachers*

## 85 гадоў
## з часу ўтварэння Ашмянскага раёна (1940)




Утвораны 15 студзеня 1940 г. Першапачаткова ўваходзіў у склад Вілейскай і Маладзечанскай абласцей, з 20 лістапада 1960 г. уключаны ў Гродзенскую вобласць. Размешчаны ў яе паўночна-ўсходняй частцы. На захадзе мяжуе з Літвой, на поўначы – з Астравецкім, на ўсходзе – са Смаргонскім, на поўдні – з Іўеўскім раёнамі Гродзенскай вобласці, на паўднёвым усходзе – з Валожынскім раёнам Мінскай вобласці. Адміністрацыйны цэнтр – г. Ашмяны знаходзіцца за 220 км ад г. Гродна, 17 км ад чыгуначнай станцыі Ашмяны, 135 км ад Мінска, 55 км ад Вільнюса (Літва).

Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў раёне 10 сельсаветаў, 364 населеныя пункты.

Плошча раёна 1,2 тыс. кв. км, размешчаны ў межах Ашмянскага ўзвышша.

Па тэрыторыі раёна працякаюць больш за 20 рэк. Найбольшыя з іх – Ашмянка (49 км), Гальшанка, Клява, Алянка і інш.

Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі занята 53% тэрыторыі. Глебы дзярнова-падзолістыя і тарфяна-балотныя. Лясы займаюць 34% тэрыторыі. Асноўныя галіны сельскай гаспадаркі: мяса-малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля, ільнаводства, вырошчваюць збожжавыя, кармавыя культуры, бульбу, рапс, агародніну. У склад АПК раёна уваходзяць 7 камунальных сельскагаспадарчых унітарных прадпрыемстваў (КСУП), “База эксперыментальная Баруны”, 16 фермерскіх гаспадарак. Дзейнічаюць 6 прамысловых прадпрыемстваў: ААТ “Радыётэхніка”, ААТ “Белкава”, РУП “Ашмянскі дражджавы завод”, ААТ “Ашмянскі мясакамбінат”, ААТ “Гальшанскі крухмальны завод” (вёска Рамейкішкі), ААТ “Ашмянскі

сыраробчы завод” філіял ААТ “Лідскі малочна-кансервавы камбінат”. гравійна-сартавальны завод “Баруны” філіял ААТ “Дарбуд-індустрыя".

На 01.01.2024 г. насельніцтва раёна складала 29,1 тыс. чалавек.

Аказаннем медыцынскай дапамогі жыхарам раёна займаюцца 24 установы аховы здароўя: Ашмянская раённая бальніца, аддзяленне хуткай медыцынскай дапамогі, стаматалагічнае аддзяленне, бальніца сястрынскага догляду (аг.Мураваная Ашмянка), 7 амбулаторый, 13 ФАПаў.

Сістэма адукацыі раёна прадстаўлена 28 установамі адукацыі: 1 гімназія, 11 сярэдніх школ, 2 базавыя школы, 9 ясляў-садоў, 1 Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці, 1 Установа дадатковай адукацыі, Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, Сацыяльна-педагагічны цэнтр з аддзяленнем дзіцячага прытулку, аздараўленчы лагер “Дружба”. Працуюць 2 дамы сямейнага тыпу. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі навучаецца 3645 навучэнцаў.

Культурным абслугоўваннем насельніцтва ў раёне займаецца 31 установа культуры: 13 бібліятэк, 15 устаноў клубнага тыпу, 2 дзіцячыя школы мастацтваў, краязнаўчы музей імя Ф. К. Багушэвіча.

З 21 кастрычніка 1939 года выдаецца раённая газета “Ашмянскі веснік” (“Знамя свабоды”, «Красное знамя»).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Даведка “Аб арганізацыі Ашмянскага раёна Вілейскай вобласці БССР”: Дакументы сведчаць // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.241.*
*2. Ошмянскій район. – Режим доступа:*
*https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9E%D1%88%D0%BC%D1%8F%D0%BD%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D1%80%D0%B0%D0%B9%D0%BE%D0%BD*

## *Люты*

### **90 гадоў**
### **Мантураў Іосіф Іосіфавіч (1935 – 2015)**



Вядомы на Ашмяншчыне краязнавец. Нарадзіўся 25.02.1935 г. у в.Турно на Беласточчыне, дзе пражываў да 1945 г. Па дамоўленасці ўрада БССР і Польскага камітэта Нацыянальнага вызвалення аб абмене насельніцтвам, у ліку іншых беларусаў сям'я пераехала на Гродзеншчыну. У снежні 1945 г. пасяліліся на Ашмяншчыне ў в.Міхалконі, тут пачалася вучоба ў школе.

Тэрміновую ваенную службу праходзіў на флоце, служыў у Таліне. Пасля службы працаваў на розных пасадах у сельвыканкамах Ашмянскага раёна, сакратаром парткамаў калгаса "Іскра", саўгаса "Гальшаны", старшынёй калгаса "Перамога", намеснікам старшыні калгаса імя Крупскай. Скончыў Навагрудскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1964), у 1969 г. паступіў у Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут.

Узнагароджаны медалямі "За доблесную працу", «60 лет Победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.», «70лет Победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.», "70 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў", Ганаровым знакам "Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва" (1973, 1974, 1975) і інш.

Пасля выхаду на пенсію (1995) пачаў актыўна займацца краязнаўствам, хаця гэта было даўняе захапленне, якому ён аддаваўся кожную вольную хвіліну. Некалькі гадоў запар вёў краязнаўчы гурток у Вайшнарышскай школе, напісаў яе гісторыю. Сабраў шматлікі матэрыял па гісторыі вёсак Шчапанавічы, Кляўіца, Доржы, аб ветэранах калгаса, маці-гераінях, настаўніках. Сабраны звесткі пра могільнік часоў Першай сусветнай вайны каля в.Доржы. Быў частым госцем у школах свайго рэгіёна, бібліятэках, дзе выступаў з расповедам пра гісторыю мясцовасці. Друкаваўся на старонках раённай газеты "Ашмянскі веснік".

*Крыніцы інфармацыі:*


*1. Булкевіч, Э. Чествование энтузіаста-краеведа : Іосіфа Іосіфовіча Мантурова / Э. Булкевіч // Ашмянскі веснік. – 2005. – 30 сакавіка.*

*2. Драздова, В. Шэсцьдзесят год на Ашмяншчыне / В. Драздова // Ашмянскі веснік. – 2004. – 2 ліпеня. – С. 4.*


## *Сакавік*

### **80 гадоў**
### **Арлоўскі Валерый Мікалаевіч (1945)**



Палкоўнік, кандыдат ваенных навук (1984), дацэнт (1991). Нарадзіўся 03.03.1945 г. ва Уруччы Мінскай вобласці. Закончыў Гальшанскую СШ (1963), Мінскае вышэйшае інжынернае радыётэхнічнае вучылішча войскаў проціпаветранай абароны (1968), Ваенную камандную акадэмію проціпаветраных войскаў (1978), ад'юнктуру пры гэтай акадэміі. У 1968 – 1996 гг. служыў ва Узброеных сілах СССР і Расіі: намеснік камандзіра батарэі дывізіёна проціпаветранай абароны, камандзір батарэі, камандзір дывізіёна; выкладчык, старшы выкладчык, намеснік начальніка кафедры Горкаўскага вышэйшага зенітна-ракетнага каманднага вучылішча проціпаветранай абароны. З 1996 г. у запасе. Закончыў Ніжагародскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт (1997), працаваў у адміністрацыі Ніжняга Ноўгарада (Расія).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Арлоўскі Валерый Мікалаевіч: Звязаны лёсам з Ашмяншчынай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.573-574.*

## 135 гадоў
## Адважны Вінцук (1890 – 1978)



(Сапраўднае Германовіч Язэп Станіслававіч, псеўданім Лявон Ветрагон). Беларускі пісьменнік (паэт, перакладчык, мемуарыст), каталіцкі духоўнік. Нарадзіўся 04.03.1890 г. у мястэчку Гальшаны Ашмянскага раёна, З сям'і рамесніка. Закончыў парафіяльную школу ў

Гальшанах (1902), гарадскую ў Ашмянах (1906). Жыў у Вільні. Закончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1913). Служыў ксяндзом на Беласточчыне, у 1918 г. – у Вялікай Лапеніцы (Ваўкавыскі раён), у 1923 г. у Лужках на Віцебшчыне. Усюды праводзіў беларускую патрыятычную работу сярод прыхаджан. У 1920 г. арганізаваў беларускую школу. Прследаваўся касцельнымі ўладамі. У 1924 г. уступіў у ордэн марыянаў у Друі, быў пробашчам, выкладчыкам рэлігіі і лацінскай мовы ў гімназіі. У 1932 г. накіраваны місіянерам у Харбін (Кітай), дапамагаў беспрытульным, выкладаў у ліцэі. У 1948 г. арыштаваны кітайскай міліцыяй і перададзены ў СССР. Зняволены ў канцлагерах Сібіры. Вызвалены ў 1955 г. Выехаў у Польшчу, у 1959 г. у Рым. Жыў пераважна ў Англіі. Рэдагаваў часопіс “Божым шляхам” (1964 – 1974). Друкаваў гумарыстычныя вершы, байкі, празаічныя творы, сярод якіх “Як Казюк сабраўся да споведзі” (1928), “Як Ганулям збіралася ў Аргентыну” (1930), “Адам і Анелька” (1931), “Хлопец” (1935) і інш. Выдаў пераклады казак П.Яршова “Канёк-гарбунёк” (1932), А.Пушкіна “Казка пра рыбака і рыбку” (1935). Памёр 26.12.1978 г. у Лондане.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Адважны Вінцук: Іх імёны ў гісторыі Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.137-138.*

## 85 гадоў
## Корзун Яніна Іванаўна (1940)



Педагог, краязнавец, кіраўнік народнага гісторыка-краязнаўчага музея імя Э.Корзуна Гальшанскай СШ. Нарадзілася 14.03.1940 г. у в.Куцавічы Ашмянскага раёна. Закончыла Гродзенскі Дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы (1958). Працавала настаўніцай пачатковых класаў Валовіцкай

ПШ, Гальшанскай СШ. З 2001 па 2021 гг. – кіраўнік народнага гісторыка-краязнаўчага музея імя Э.Корзуна Гальшанскай СШ. Узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі БССР, юбілейным медалём да 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, іншымі ўзнагародамі.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Народны музей імя Эдуарда Корзуна: ДУА "Гальшанская сярэдняя школа" // Народныя музеі ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мн.: БелЭН імя Петруся Броўкі, 2019. – С. 16-17.*
*2. Рудзік, К., Радкевіч, Д. Нашы музеі – сярод лепшых на гомельскім форуме. – Рэжым доступу: https://www.osh.by/?p=11478*
*3. Школьный музей имени Э.С. Корзуна. – Режим доступа: https://golshany.schools.by/pages/virtualnyj-muzej*

## 185 гадоў
## Багушэвіч Францішак Бенядзікт Казіміравіч (1840 – 1900)



Паэт, празаік, публіцыст, рэвалюцыйны дэмакрат. Нарадзіўся 21.03.1840 г. у былым фальварку Свіраны Вільнюскага раёна, Літва. Бацька, Казімір Восіпавіч і маці, Канстанцыя Галаўня, паходзілі з незаможнай мясцовай шляхты. Сям'я Багушэвічаў жыла спачатку ў Свіранах, у сваякоў маці, але ў перыяд паміж 1841 г. і 1846 г. пераехала ў невялікі маёнтак Кушляны, атрыманы бацькам у спадчыну ў 1837 г. Дзіцячыя гады пісьменніка прайшлі ў асяроддзі, блізкім да сялянскага. У 1852 г. ён разам з братам Валяр'янам паступіў у чатырохкласную базыльянскую школу, потым вучыўся ў гімназіі, якую закончыў у 1861 г. Асаблівую цікавасць выказваў да славянскіх моў, матэматыкі і заканадаўства.

У 1861 г. Ф.Багушэвіч паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, але не закончыў. Каб быць бліжэй да народа, уладкаваўся настаўнікам у народнай школе в.Доцішкі Лідскага павета (цяпер Воранаўскі раён). У 1865 г. паступіў у Нежынскі юрыдычны ліцэй, які закончыў у 1868 г. Працаваў судовым следчым на Украіне, потым адвакатам у Вільні.

У 1874 г. ажаніўся з зямлячкай Габрыеляй Міхайлаўнай Шкленік. У іх нарадзіліся дзеці: дачка Канстанцыя, сыны Тамаш і Валяр'ян.

Працуючы адвакатам Ф.Багушэвіч адстойваў правы простых людзей.

Вершы Ф.Багушэвіч пачаў пісаць у юнацкім узросце. Шматлікія вершаваныя творы склалі 2 паэтычныя зборнікі, выдадзеныя па цэнзурных умовах за мяжою: "Дудка беларуская" (1891), "Смык беларускі" (1894). Асноўныя тэмы творчасці Ф.Багушэвіча: жыццё беларускага народа, барацьба з прыгнятальнікамі, адносіны да роднага слова.

У 1898 г. Ф.Багушэвіч цяжка захварэў і пераехаў жыць у Кушляны. У 1900 г. памёр. Пахаваны на могілках у Жупранах.

У савецкі час творы Ф.Багушэвіча сталі духоўным набыткам усяго народа. У цэнтры Жупран і на яго магіле пастаўлены помнікі. Імя Ф.Багушэвіча прысвоена Ашмянскаму краязнаўчаму музею, Жупранскай сярэдняй школе. Адрэстаўрыравана сядзіба ў Кушлянах, дзе створаны літаратурны музей.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Багушэвіч Францішак Бенядзікт Казіміравіч: Іх шлях пралёг праз Ашмяншчыну // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.146-149.*

## 55 гадоў
## Санюк Аліна Мікалаеўна (1970)



Журналіст, педагог, паэтэса. Нарадзілася 25.03.1970 г. у в. Лазяны Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла Табольскую БШ (1985), Лідскае педагагічнае вучылішча па спецыяльнасці "настаўнік пачатковых класаў" (1989), Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (філалагічны факультэт, 1996). На працягу дзесяці гадоў настаўнічала ў школах Ашмянскага раёна. У 1998–1999 гг. – другі сакратар Ашмянскай раённай арганізацыі ГА БПСМ (цяпер БРСМ). З 1999 г.– супрацоўнік

рэдакцыі газеты “Ашмянскі веснік”: загадчык аддзела грамадска-палітычнага жыцця, адказны сакратар, з 2005 г. – наместнік галоўнага рэдактара. Кіраўнік клуба “Школа маладога журналіста” (2003), літаратурнага аб’яднання пры рэдакцыі (1999).

Неаднаразовы пераможца і прызёр рэспубліканскіх і абласных творчых конкурсаў сярод журналістаў. Прызёр (другое месца) абласнога спаборніцтва сярод журналістаў абласных, раённых і гарадскіх газет, тэлебачання і радыё (2012).

Прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна. Выбіралася дэлегатам II Усебеларускага народнага сходу (2001), дэпутатам раённага Савета дэпутатаў дваццаць чацвёртага склікання (2003).
Захапляецца паэзіяй, піша вершы. Творчы дэбют А. Санюк адбыўся ў раённай газеце “Ашмянскі веснік” у 1997 г. Тэматыка паэзіі – лірычна-філасофская: каханне, роздум пра час, любоў да роднага краю, блізкіх людзей. Яе вершы ўвайшлі ў зборнік паэтаў памежжа “Сустрэчы” (2013), друкаваліся на старонках газеты “Ашмянскі веснік”, у паэтычным альманаху “Poeziyos tiltai” (2021).

*Крыніцы інфармацыі:*

1. *В числе призеров республиканского конкурса журналист “Ашмянскага весніка”. – Рэжім доступа:* [https://www.osh.by/?p=94846](https://www.osh.by/?p=94846)
*2. Санюк, А. Дзесяць год зусім не семдзесят / Аліна Санюк // Нікалаеў, Ю.І. На хвалі часу, у плыні жыцця: прысвячаецца сямідзесяцігоддзю раённай газеты “Ашмянскі веснік” / Ю.І.Нікалаеў; пад рэд. : Г.М.Давідовіч, Ю.І.Нікалаеў, А.М.Санюк. – Ліда : Лідская друкарня, 2009. – С. 153–154.*

## 90 гадоў
## Загорскі Браніслаў Іпалітавіч (1935)



Беларускі гісторык, педагог, кандыдат гістарычных навук (1971). Нарадзіўся 29.03.1935 г. у в.Жупраны. Закончыў Жупранскую СШ (1955), гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1960).

Працаваў выкладчыкам у Гарадзішчанскім вучылішчы механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі №27 (в.Савічы Баранавіцкага раёна), у Казлоўшчынскім сельскім ПТВ №15 Дзятлаўскага раёна. Вучыўся ў аспірантуры на кафедры новай і навейшай гісторыі БДУ, пасля працаваў у Акадэміі навук БССР. У маі 1971 г. абараніў дысертацыю на тэму "Польска-французскія адносіны 1919–1925 гг.". Займаўся вывучэннем дзейнасці беларускай эміграцыі ў краінах Захаду ў перыяд "халоднай вайны". Падрыхтаваў і надрукаваў каля 30 навуковых прац. З 1975 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, дацэнт кафедры паліталогіі і міжнародных адносін. Сааўтар метадычнага дапаможніка "Сацыялогія міжнародных адносін" (2000).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Загорскі Браніслаў Іпалітавіч: Нарадзіліся на Ашмяншчыне // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.566-567.*

## *Красавік*

### 140 гадоў
### Рак-Міхайлоўскі Сымон Аляксандравіч (1885 – 1938)



Беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, публіцыст, педагог, асветнік. Нарадзіўся 14.04.1885 г. у в. Максімаўка Вілейскага павета Віленскай губерні, цяпер Маладзечанскі раён. Дырэктар беларускай настаўніцкай семінарыі ў мястэчку Баруны Ашмянскага павета (1920 – 1922). Беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, публіцыст, педагог, асветнік. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1904), педагагічны інстытут у Феадосіі (1912). Працаваў у школах Свянцянскага і Вілейскага паветаў, займаўся культурна-асветніцкай дзейнасцю, збіраў фальклор. У рэвалюцыю 1905–1907 гг. прапагандаваў ідэі сацыяльнага і нацыянальнага

вызвалення, быў выбраны хадаком у Дзяржаўную думу. У 1914–1917 гг. служыў у арміі, вёў рэвалюцыйную агітацыю сярод салдат на Румынскім фронце. Член Беларускай сацыялістычнай грамады (1917), Рады Беларускай Народнай Рэспублік (1918). Пасля расколу БСГ адзін са стваральнікаў і член ЦК Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. Займаўся арганізацыяй беларускіх пачатковых школ. У 1918–1920 гг. жыў у Гродне, выкладаў у Гродзенскай беларускай гімназіі, супрацоўнічаў у газеце "Беларускае слова".

У 1919 г. С. Рак-Міхайлоўскі распачаў актыўную работу па адкрыцці беларускай настаўніцкай семінарыі ў мястэчку Баруны, якая пачала працаваць у 1920 г. Першы набор вучняў склаў 60 чалавек. У семінарыі не існавала падзелу па канфесіях: і праваслаўныя, і каталікі прымаліся ў аднолькавай колькасці. Выкладаліся прадметы: рэлігія, беларуская, польская, нямецкая мовы, геаметрыя, арыфметыка, геаграфія, гісторыя, прыродазнаўства, спевы. Увесь курс навукі разлічаны быў на 4 гады. Але з боку польскіх улад пачалося ганенне на беларускамоўныя ўстановы. 15 мая 1921 г. беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах па загаду дырэктара Дэпартамента Асветы Ліхтаровіча была закрыта, не зрабіўшы ні аднаго выпуску. С. Рак-Міхайлоўскі ў 1922 г. пакінуў Баруны.

У лістападзе 1922 г. выбраны паслом у польскі сейм. У 1926 г. уступіў у КПЗБ. У 1927 г. арыштаваны, прыгавораны да 12 гадоў зняволення. У 1930 г. датэрмінова вызвалены і перапраўлены ў Мінск. Працаваў у сектары навукі Наркамата Асветы БССР. 16.08.1933 г. арыштаваны органамі АДПУ па справе "Беларускага нацыянальнага цэнтра", прыгавораны да 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Асобай тройкай НКУС БССР 14.11.1938 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Растраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1956 г. У Маладзечне яго імем названа вуліца.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах (1920–1922) // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.209-210.*

*2. Сымон Аляксандравіч Рак-Міхайлоўскі. – Рэжым доступу:* *https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%A1%D1%8B%D0%BC%D0%BE%D0%BD_%D0%90%D0%BB%D1%8F%D0%BA%D1%81%D0%B0%D0%BD%D0%B4%D1%80%D0%B0%D0%B2%D1%96%D1%87_%D0%A0%D0%B0%D0%BA-%D0%9C%D1%96%D1%85%D0%B0%D0%B9%D0%BB%D0%BE%D1%9E%D1%81%D0%BA%D1%96*

# *Май*

## 55 гадоў
## Барбашынскі Андрэй Станіслававіч (1970)



Чэмпіён XXV Алімпійскіх гульняў 1992 г. у Барселоне (Іспанія), выступаў у складзе аб'яднанай каманды СНД па гандболе. Заслужаны майстар спорту СССР (1992). Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2006). Нарадзіўся 4.05.1970 г. у г.Ашмяны. Свой чэмпіёнскі шлях пачаў у 12 гадоў у ДЮСШ г. Ашмяны пад кіраўніцтвам трэнера Віктара Рамулевіча. Выступаў за гандбольны клуб "СКА-Мінск" (1988–1995) пад кіраўніцтвам знакамітага трэнера Спартака Мірановіча. (з адным гадавым перапынкам 1993–1994, калі выступаў за іспанскі гандбольны клуб "Хувентуд"). Пазней паспрабаваў свае сілы ў венгерскім "Фотэксе", доўгі час выступаў за нямецкія клубы "Хамельн", "Эмсттэдэн". Іншыя спартыўныя дасягненні: чэмпіён свету сярод юніёраў 1989 г., бронзавы прызёр чэмпіянату свету сярод юніёраў 1991г., чэмпіён СССР 1989 г., сярэбраны прызёр чэмпіянату СССР 1990 г., бронзавы прызёр чэмпіянату СССР 1991 г., сярэбраны прызёр чэмпіянату СНД 1992 г., уладальнік Кубка СССР 1989 г.

Званне "Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны" прысвоена рашэннем Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў №18-7 ад 19.09.2006 г. за дасягненне высокіх спартыўных вынікаў, асаблівыя заслугі ў развіцці фізічнай культуры і спорту, вялікі ўклад у прапаганду ідэй алімпійскага руху ў горадзе Ашмяны і Ашмянскім раёне. Імя А. С. Барбашынскага прысвоена Ашмянскай ДЮСШ (2017). Установлена правядзенне Міжнароднага турніру па гандболе сярод юнакоў на прызы алімпійскага чэмпіёна Барбашынскага А. С. (з 2012). Першыя два турніры (2012, 2014) адбыліся ў Гродне, а пачынаючы з 2016 г. спаборніцтвы традыцыйна прымае горад Ашмяны.

Сёння Андрэй Барбашынскі жыве ў Беларусі, у г. Мінску. Працуе дырэктарам УА "Рэспубліканскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага

рэзерву” (РДВАР, з 29.07.2024), з’яўляецца намеснікам старшыні грамадскай арганізацыі “Беларуская федэрацыя гандбола”. Спартыўную кар’еру бацькі працягваюць сыны А. Барбашынскага. Старэйшы, Мацвей, выступае за юнацкую зборную нашай краіны, у жніўні 2023 г. на гандбольнай пляцоўцы на пазіцыі лінейнага, разам з камандай БДУФК-СКА-РГУАР стаў чэмпіёнам II гульняў краін СНД. Малодшы, Захар, сур'ёзна займаецца баскетболам.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Барбашынскі Андрэй Станіслававіч: Спартыўны гонар Ашмяншчыны // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.582.*
*2. «Для своих детей я не олимпийский чемпион, а прежде всего друг и отец». – Режим доступа:* https://zviazda.by/ru/news/20231102/1698907025-dlya-svoih-detey-ya-ne-olimpiyskiy-chempion-prezhde-vsego-drug-i-otec
*3. Коллективу РГУОР представлен новый руководитель. – Режим доступа:* https://rguor.by/%D1%81%D0%B5%D1%80%D0%B2%D0%B8%D1%81%D1%8B/%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D0%BE%D1%81%D1%82%D0%B8/p-147103.html

## 90 гадоў
## Іскроў Эдуард Уладзіміравіч (1935 – 1994)



Заслужаны рацыяналізатар Беларусі (1970). Нарадзіўся 8.05.1935 г. на Віцебшчыне. Працаваў токарам на заводзе “Рухавік” г.Талін. Служыў у Ваенна-марскім флоце (1954–1958). З 1958 г. у Ашмянскім раёне. Працаваў у райаб’яднанні “Сельгастэхніка”, калгасе “Ясная Паляна”, райаб’яднанні “Сельгасхімія”: токар, механік, загадчык майстэрні, механік жывёлагадоўчага комплексу, майстар-наладчык, слесар.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Іскроў Эдуард Уладзіміравіч: Заслужаны рацыяналізатар: Вызначыліся працай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.565.*

## 70 гадоў
## Бізюк Уладзімір Аляксандравіч (1955)



Педагог, Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2019). Нарадзіўся 25.05.1955 г. у в.Солы Смаргонскага раёна. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, фізічны факультэт. Пасля заканчэння быў накіраваны на працу ў г.Светлагорск Гомельскай вобласці. З 1985 г. у Ашмянах. На працягу 1996-2019 гг. дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Ашмянская школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў". У 2020–2024 гг. – дырэктар ДУА "Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К.Багушэвіча".

Захапляецца жывапісам. Тэматыка яго творчых прац – прырода Беларусі, родных мясцін, утульныя мястэчкі з храмамі і каларытныя хутары, нацюрморты.

За шматгадовую працу і значны асабісты ўклад у сістэму адукацыі Ашмянскага раёна рашэннем Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў № 67 ад 26.06.2019 г. прысвоена званне "Ганаровы грамадзянін г.Ашмяны".

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Бизюк Владимир Александрович: Почетные граждане. – Режим доступа:* https://www.oshmiany.gov.by/by/pochetnye-grajdane-by
*2. «Это наши корни, здесь мы черпаем то, что нам надо для жизни». – Режим доступа:* https://ctv.by/news/kultura/eto-nashi-korni-zdes-my-cherpaem-to-chto-nam-nado-dlya-zhizni-posmotrite-na-belorusskie-pejzazhi-kotorye-pishet-etot-hudozhnik

## 60 гадоў
## Вішнеўскі Анатоль Зянонавіч (1965 – 2006)



Педагог, самадзейны паэт. Нарадзіўся 31.05.1965 г. на х.Асінаўка непадалёку ад Ашмян. У 1972 г. пайшоў у 1 клас Павяжскай БШ, 9 і 10 класы закончыў у Барунскай СШ. Затым была служба ў Савецкай Арміі, вучоба на філфаку БДУ.

Працаваў у Анкудскай БШ настаўнікам, у Вайшнарышскай БШ – спачатку настаўнікам, затым намеснікам дырэктара школы. Пасля быў назначаны дырэктарам Мураванаашмянкоўскай СШ, адкуль пераведзены на пасаду інспектара аддзела адукацыі, дзе працаваў амаль 4 гады. Потым працаваў у Жураўскай БШ настаўнікам беларускай мовы і літаратуры.

Вершы пачаў пісаць у школьным узросце. Друкаваўся ў часопісе "Маладосць", раённай газеце "Ашмянскі веснік", з вершамі выступаў на рэспубліканскім радыё. Запрашаўся на сустрэчы з чытачамі ў бібліятэкі раёна. Ашмянскай раённай цэнтральнай бібліятэкай выдадзены зборнікі вершаў "Хвіліны шчасця і самоты" (2002), "Сонца ў хвалях блакіту" (2007).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Вішнеўскі Анатоль Зянонавіч: З крыніц народных // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.587-588..*

## *Чэрвень*

### 80 гадоў
### Крамарэнка Віктар Уладзіміравіч (1945)



Заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь (2018), двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, сааўтар праектаў "Нацыянальная бібліятэка Беларусі", "Чыгуначны вакзал у Мінску", "Музей гісторыі Вялікай

Айчыннай вайны”, Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2015). Нарадзіўся 11.06.1945 г. у г.Гродна. Дзяцінства прайшло ў Ашмянах. Выпускнік сярэдняй школы №1 г. Ашмяны.

Скончыў архітэктурны факультэт Беларускага палітэхнічнага інстытута (1968). Працаваў архітэктарам у найбуйнейшых праектных арганізацыях краіны: з 1968 г. па 1976 г. – у Белдзяржпраекце; з 1976 па 1998 г. – у Інстытуце “Мінскпраект” на пасадах ГАПа, кіраўніка АКМ і галоўнага архітэктара інстытута (1983-1988). З 1998 г. кіраўнік персанальнай творчай майстэрні.

У 2002 г. В. Крамарэнка прызнаны беларускімі СМІ “Чалавекам года”. Узнагароджаны медалём “За працоўныя заслугі” (2007). У 2013 г. удастоены звання лаўрэата ганаровага прыза “Дойлід Беларусі”. Уладальнік звыш 20 айчынных і міжнародных дыпломаў і сертыфікатаў. За вялікую і мэтанакіраваную працу па фарміраванні пачуцця гонару за сваю краіну, асабісты ўклад у грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне моладзі рашэннем Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў № 21 ад 19.06.2015 г.удастоены звання “Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны”.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Козел, Л. Маэстро архитектуры, созидающий на века: Наши земляки: Виктор Крамаренко /Людмила Козел // Ашмянскі веснік. – 2015. 21 лютага (№ 13). – С.3.*
*2. Козел, Л. Маэстро архитектуры, созидающий на века. – Режим доступа:* https://www.osh.by/?p=48591
*3. Крамаренко Виктор Владимирович: Почетные граждане. – Режим доступа:* /https://oshmiany.gov.by/ru/pochetnye-grajdane-ru/

## 60 гадоў
## Чудзілоўскі Сяргей Дзмітрыевіч (1965)



Аграрый, спецыяліст у галіне кіравання, кандыдат у майстры спорту па лёгкай атлетыцы. Нарадзіўся 22.06.1965 г. у в.Драбавічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. Скончыў Казлоўшчынскую СШ (1981), Гродзенскі

сельскагаспадарчы інстытут (1989), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2012). Працоўны шлях пачынаў начальнікам вытворчага ўчастка ў адной з гаспадарак Дзятлаўскага раёна. Пазней кіраваў вучэбна-вытворчым камбінатам і раённым аддзяленнем "Белдзяржстраху". Старшыня СПК імя Кляцкова Ашмянскага раёна. З 2014 г. – дырэктар ААТ "Гальшанскі крухмальны завод", прадпрыемства стабільнае і канкурэнтаздольнае, дэманструе лепшыя паказчыкі па экспарце ў Ашмянскім раёне.

Узнагароджаны медалём "За працоўныя заслугі". Дэпутат Кальчунскага сельскага Савета дэпутатаў. Член Беларускай партыі "Белая Русь". Жыве ў в.Будзёнаўка Ашмянскага раёна.

Захапляецца спортам. С.Чудзілоўскі, кандыдат у майстры спорту па лёгкай атлетыцы, доўгі час быў членам зборнай каманды Гродзенскай вобласці па лёгкай атлетыцы, у 1988 г. прымаў удзел у спаборніцтвах на кубак СССР, Універсіядзе СССР, чэмпіянаце БССР.

*Крыніцы інфармацыі:*


*1. Директор Гольшанского крахмального завода Сергей Чудиловский: "Успешным может быть только здоровый человек". – Режим доступа:* [https://grodnonews.by/news/zdorove-i-krasota/direktor_golshanskogo_krakhmalnogo_zavoda_sergey_chudilovskiy_uspeshnym_mozhet_byt_tolko_zdorovyy_ch.html](https://grodnonews.by/news/zdorove-i-krasota/direktor_golshanskogo_krakhmalnogo_zavoda_sergey_chudilovskiy_uspeshnym_mozhet_byt_tolko_zdorovyy_ch.html)

*2. Чудзілоўскі Сяргей Дзмітрыевіч // Краязнаўчы каляндар на 2024 год / склад. А.В. Кучынская. – Гродна , 2024. – С. 26.*


## *Ліпень*

### 80 гадоў
### Філіповіч Тамара Уладзіміраўна (1945)



Дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч, Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2006). Нарадзілася 23.07.1945 г. у в.Васількі Лохвіцкага раёна Палтаўскай вобласці (Украіна).

Закончыла Палтаўскі тэхнікум мясной прамысловасці (1964), Маскоўскі тэхналагічны інстытут мясной і малочнай прамысловасці (1971),

Усесаюзны інстытут стандартызацыі, якасці і метралогіі (1976), Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1990). Працоўную дзейнасць пачала ў 1964 г. на Ашмянскім мясакамбінаце. Пачынала майстрам каўбаснага цэха, затым – галоўны інжынер прадпрыемства, у 1978–2015 гг. дырэктар ААТ "Ашмянскі мясакамбінат". Пад яе кіраўніцтвам Ашмянскі мясакамбінат дасягнуў высокіх паказчыкаў дзейнасці, стаў прадпрыемствам з высокааснашчаным тэхналагічным працэсам.

Тамара Уладзіміраўна актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 2-га і 3-га скліканняў, дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў (1997), неаднойчы – дэпутатам Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў.

Узнагароджана медалямі "За доблесную працу", "Ветэран працы" Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Ганаровай граматай Савета Міністраў РБ. Прысвоена званне "Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны" (2006).

Т. У. Філіповіч – аўтар кнігі "Падарожжа па Ашмянскаму краю" (2010), у якой яна паўстала як майстар мастацкай фатаграфіі, прадставіўшы на суд чытачоў і гледачоў свае фотаработы, у якіх адлюстроўваецца мінулае і сучаснае Ашмяншчыны. У 2011 г. выйшла другая кніга «Время и люди».

*Крыніцы інфармацыі:*


*1. Тамара Уладзіміраўна Філіповіч. – Рэжым доступу:* https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%A2%D0%B0%D0%BC%D0%B0%D1%80%D0%B0_%D0%A3%D0%BB%D0%B0%D0%B4%D0%B7%D1%96%D0%BC%D1%96%D1%80%D0%B0%D1%9E%D0%BD%D0%B0_%D0%A4%D1%96%D0%BB%D1%96%D0%BF%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%87

*2. Филиппович Тамара Владимировна // Кто есь Кто в Республике Беларусь. Деловой мир СНГ. 2006 / Под ред. И.В.Чекалова. – Мн.: Энциклопедикс, 2006. – С. 384.*

*3. Филиппович Тамара Владимировна: Почетные граждане. – Режим доступа:* https://www.oshmiany.gov.by/ru/pochetnye-grajdane-ru/


## 75 гадоў
## Рамулевіч Віктар Баляслававіч (1950)



Заслужаны трэнер Беларусі (1987). Нарадзіўся 23.07.1950 г. у г.Ашмяны. Закончыў СШ №1 (1967), Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1972). Трэнер па ручным мячу (гандбол) Ашмянскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы (з 1972 г.). Займацца гандболам асабіста пачаў з 11 гадоў, як толькі стаў культывавацца гэты від спорту ў Беларусі. Добра гуляў у футбол, валейбол і баскетбол. Заканчваючы сярэднюю школу, трапіў у юнацкую зборную краіны да Спартака Мірановіча (у далейшым знакамітага гандбольнага трэнера Беларусі і СССР). На Спартакіядзе народаў СССР (1971) беларусы сенсацыйна заваявалі бронзу.

Ганаровае званне "Заслужаны трэнер Беларусі" прысвоена ў 1987 г. Выхаваў вялікую колькасць юных гандбалістаў, падрыхтаваў алімпійскага чэмпіёна А.С.Барбашынскага.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Гандбольный тренер из Ошмян Виктор Ромулевич: «Приезжаю своей «деревней» и обыгрываю фаворитов». – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/gandbolnyy-trener-iz-oshmyan-viktor-romulevich-priezzhayu-svoey-derevney-i-obygryvayu-favoritov.html*

*2. Рамулевіч Віктар Баляслававіч: Заслужаны трэнер: Вызначыліся працай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.565.*

## *Верасень*

### 70 гадоў
### Болзан Іван Вікенцьевіч (1955)



Беларускі спартсмен і трэнер (пажарна-ратавальны спорт), майстра спорту СССР (1982), бронзавы прызёр чэмпіянату СССР (1983), сярэбраны прызёр чэмпіянату МУС СССР (1984), шматразовы чэмпіён і прызёр чэмпіянатаў Расіі і Беларусі. Нарадзіўся 04.09.1955 г. у в.Гудзяняты Ашмянскага раёна. Скончыў Навасёлкаўскую СШ (1972), пажарна-тэхнічнае вучылішча МУС СССР (1982, г.Іванава, Расія), вышэйшую інжынерна-

пажарную тэхнічную школу МУС СССР (1988, Масква). Працаваў у МНС Гродзенскай вобл. Да выхаду на заслужаны адпачынак Іван Вікенцьевіч займаў пасаду галоўнага спецыяліста аддзела службы і боегатоўнасці падраздзяленняў Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, актыўна займаўся пажарна-прыкладным спортам. У перыяд з 1989 па 2005 гг. кіраваў зборнай камандай Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС. І. В. Болзан шчодра дзяліўся з маладымі спартсменамі вопытам, падрыхтаваў заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь па пажарна-выратавальным спорце, двух майстроў спорту міжнароднага класа і каля 10 майстроў спорту. Юнацкая каманда пад яго кіраўніцтвам неаднаразова станавілася пераможцам і прызёрам чэмпіянатаў Рэспублікі Беларусь.  Сёння падпалкоўнік унутранай службы запасу І. В. Болзан жыве ў г. Гродна.

*Крыніцы інфармацыі:*


1. *Болзан Иван Викентьевич.  – Режим доступа:* [https://elib.bspu.by/bitstream/doc/11793/3/%D0%AD%D0%BD%D1%86%D0%B8%D0%BA%D0%BB%D0%BE%D0%BF%D0%B5%D0%B4%D0%B8%D1%8F%20%D0%91%D0%BE%D0%BB%D0%B8%D0%B2%D0%B0%D1%80%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B5%20%D0%B8%D0%B3%D1%80%D1%8B%2C%20%D0%A1%D0%B5%D1%80%D0%B5%D0%B4%D0%B8%D0%BD.pdf](https://elib.bspu.by/bitstream/doc/11793/3/%D0%AD%D0%BD%D1%86%D0%B8%D0%BA%D0%BB%D0%BE%D0%BF%D0%B5%D0%B4%D0%B8%D1%8F%20%D0%91%D0%BE%D0%BB%D0%B8%D0%B2%D0%B0%D1%80%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B5%20%D0%B8%D0%B3%D1%80%D1%8B%2C%20%D0%A1%D0%B5%D1%80%D0%B5%D0%B4%D0%B8%D0%BD.pdf)

2. *Болзан Іван Вікенцьевіч // Краязнаўчы каляндар на 2025 год / склад. А. В.  Кучынская. – Гродна , 2024. – С. 32.*

3. *Чествовали юбиляра.  – Режим доступа:* [https://grodno.mchs.gov.by/novosti/321513/](https://grodno.mchs.gov.by/novosti/321513/)


## 65 гадоў
## Крот Аляксандр Міхайлавіч (1960)



Беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1997). Нарадзіўся 5.09.1960 г. у в.Гальшаны. Закончыў Гальшанскую СШ (1977, залаты медаль), факультэт радыёфізікі і электронікі БДУ (1982). Працаваў у Інстытуце тэхнічнай кібернетыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (НАНБ), З

2008 г. па 2016 г. – прафесар кафедры матэматычнай фізікі БДУ. З 2016 г. – загадчык лабараторыі мадэлявання самаарганізавальных сістэм АІПІ НАН Беларусі. Кіруе падрыхтоўкай аспірантаў, магістраў, дыпломнымі работамі студэнтаў. Лаўрэат прэмій Мінскага абласнога праўлення Саюза навуковых і інжынерных таварыстваў СССР у галіне навукі і тэхнікі (1987), камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі (1990). Аўтар 320 навуковых прац, у т.л. 4 манаграфій.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Выдающиеся математики Беларуси. – Режим доступа:* [https://obm.bsu.by/matematiki/krot-aleksandr-mihajlovich/](https://obm.bsu.by/matematiki/krot-aleksandr-mihajlovich/)
*2. Крот Аляксандр Міхайлавіч: Нарадзіліся на Ашмяншчыне // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.567.*

## 105 гадоў
## Парфеновіч Феня Васільеўна (1920 - 2016)



Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Разведчыца партызанскага атрада асобага прызначэння «Храбрецы», які дзейнічаў на тэрыторыі Магілёўскай і Пінскай абласцей Беларусі. Нарадзілася 15.09.1920 г. у в.Ясень Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Удзельніца аперацыі па знішчэнню эшалона з хімічнай зброяй, які накіроўваўся ў раён баёў Курскай бітвы. Немцы збіраліся ўпершыню прымяніць гэты від знішчэння. У выніку падрыву эшалона былі здабыты балоны з хімікатамі і адпраўлены ў Маскву. За баявыя заслугі ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалём “Партызану Вялікай Айчыннай вайны за доблесць і мужнасць 1-й ступені”, юбілейнымі медалямі. Працавала бухгалтарам. З пачатку 90-х гадоў жыла ў Ашмянах. Памерла 5.03.2016 г.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. «Женщины Ошмянщины в истории Победы». – Режим доступа:* [https://osh3.oshobr.by/wp-content/uploads/2024/01/7-](https://osh3.oshobr.by/wp-content/uploads/2024/01/7-)

%D0%96%D0%B5%D0%BD%D1%89%D0%B8%D0%BD%D1%8B_%D0%9E%D0%A8%D0%9C%D0%AF%D0%9D%D0%A9%D0%98%D0%9D%D0%AB.pdf
2. *Феня Васильевна Парфенович – разведчица отряда НКГБ «Храбрецы». – Режим доступа:* *https://www.osh.by/?p=21081*

## *Кастрычнік*

### 140 гадоў
### Стрыеўскі Канстанцін Канстанцінавіч (1885 – 1938)



Рэвалюцыйны і дзяржаўны дзеяч. Нарадзіўся 2.10.1885 г. у в.Гальшаны. Бацька Канстанцін Ігнатавіч – унтэр-афіцэр вайсковай часці, размешчанай у Гальшанах. Закончыў народнае вучылішча ў Гальшанах. У 1896 г. сям'я пераязджае ў Рыгу. Жылі бедна, у 11 гадоў хлапчук пачаў працаваць. Рыжскія чыгуначныя майстэрні сталі для юнака школай працоўнай і ідэйнай загартоўкі.

Летам 1902 г. 17-гадовы К.К.Стрыеўскі ўступае ў рады РСДРП, а неўзабаве выбіраецца членам падпольнага забастовачнага камітэта чыгуначных майстэрань. У 20 гадоў стаў адным з арганізатараў забастоўкі рыжскіх чыгуначнікаў. У 1908 г. быў арыштаваны, сасланы ў Валагодскую губерню. У 1911 г. прыязджае ў Маскву, дзе працягвае рэвалюцыйную дзейнасць, у 1913 г. арыштаваны і сасланы ў паўночныя паветы Аланецкай губерні. У 1916 г. вярнуўся з ссылкі і быў прызваны ў армію, дзе працягваў рэвалюцыйную прапаганду. Прымаў удзел у Кастрычніцкім узброеным паўстанні.

З 1917 г. К.Стрыеўскі – першы камісар па харчаванні. Пасля грамадзянскай вайны працуе ў Маскве на розных партыйных і дзяржаўных пастах. У канцы снежня 1922 г. – дэлегат I з'езда Саветаў, на гэтым з'ездзе яго абралі кандыдатам у члены ЦВК СССР. Старшыня Маскоўскага саўнаргаса (1927). З чэрвеня 1930 г. – сакратар Маскоўскага абкома партыі і адначасова старшыня ВСНГ РСФСР. У 1932 г. назначаны наркомам лёгкай прамысловасці РСФР, абраны членам ЦВК СССР.

У 1937 г. К. Стрыеўскі быў арыштаваны па справе Тухачэўскага. Загінуў 21.04.1938 г. Рэабілітаваны  пасля XX з’езда КПСС.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Паўлючэнка, Н. У. Рэвалюцыянер і грамадскі дзеяч: Стрыеўскі Канстанцін Канстанцінавіч: У полымі рэвалюцый // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.170-171.*

## 75 гадоў
## Колас Валерый Паўлавіч (1950)

Беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1992). Нарадзіўся 12.10.1950 г. у г.Ашмяны. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1973). З 1974 г. – у Інстытуце ядзернай энергетыкі, з 1991 г. – у Інстытуце радыяцыйных фізіка-хімічных праблем НАН Беларусі. Намеснік дырэктара па інавацыйнай рабоце Інстытута энергетыкі НАН Беларусі (інфарм. на 2014 г.). Навуковыя інтарэсы: энергетыка; тэрмагідрадынаміка порыстых асяроддзяў; прамяністы цеплаперанос. Распрацаваў фізіка-матэматычныя асновы праектавання ядзерных рэактараў з мікрацеплавылучальнымі элементамі. Прапанаваў аўтаматызаваную сістэму інфрачырвонага выпрамянення для лакальнага забеспячэння тэмпературных умоў у аптычнай і радыёэлектроннай вытворчасці.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Колас Валерый Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 8: Канто–Кулі / Рэдкал.: Г.П.Паўкоў і інш. – Мінск, БелЭн, 1999. – с. 381.*
*2. Колас Валерый Паўлавіч // Краязнаўчы каляндар на 2025 год / склад. А.В. Кучынская. – Гродна , 2024. – С. 36.*
*3. Колос Валерий Павлович. – Режим доступа:*
http://unicat.nlb.by/auth/pls/dict.prn_ref?tu=e&tq=v0&name_view=va_all&a001=BY-SEK-355855&strq=l_siz=20

## 70 гадоў
## Адкрыццё экспазіцыі краязнаўчага музея імя Ф.Багушэвіча (16.10.1955)



27.09.1952 г. выйшла пастанова Савета Міністраў БССР № 1292 ад "Аб адкрыцці ў 1952 г. краязнаўчых музеяў БССР". Будаўніцтва памяшкання пад музей пачалося ў жніўні 1953 г. у цэнтры Ашмян на вул. Савецкай (зараз дом №80 – у ім пасля размяшчалася гарадская бібліятэка, потым раённая дзіцячая бібліятэка). У тым жа годзе музею было прысвоена імя Ф.К.Багушэвіча. У ліпені 1955 г. будаўніцтва завяршылася, а 16.10.1955 г. адбылося адкрыццё экспазіцыі. У год адкрыцця працавалі аддзел сацыялістычнага будаўніцтва і куточак, прысвечаны Ф.Багушэвічу. Меркавалася адкрыць аддзелы прыроды і гісторыі.

У 1963 г. музей быў скасаваны як дзяржаўны, пераведзены на грамадскія пачаткі і перададзены школе-інтэрнату. Размясціўся ў школьным аднапавярховым мураваным будынку (вул. Савецкая, 9). Тут пасля аднаўлення музея (1965) была створана і адкрыта для наведвальнікаў новая экспазіцыя (1968).

У 1970 г. працавала 10 залаў, дзе выстаўляліся 1264 экспанаты асноўнага фонду. Экспазіцыйная плошча ў 1984 г. складала 248 кв.м, асноўны фонд 3,3 тыс. музейных прадметаў.

У жніўні 2001 г. музей перамясціўся ў цэнтр горада (вул.Савецкая, 128). На перыяд капітальнага рамонту будынку музей часова знаходзіўся ў памяшканні па вул. Голеса, 13. У лістападзе 2009 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё выставачнай залы ў адрамантаваным будынку. Работа над сучаснай экспазіцыяй закончылася ў лістападзе 2013 г., стала адкрытай для наведвальнікаў музея. Над стварэннем экспазіцыі працавала фірма ПУП "Неф-праект" (дырэктар І.Я.Раханскі, мастак Г.А.Выгонская, архітэктар Н.В.Дарашкевіч).

На 01.01.2025 г. фонд музея налічвае 25603 экспанаты, у т.л. 12545 асноўнага фонду. Музей захоўвае прадметы археалогіі і нумізматыкі, асабістыя рэчы ашмянцаў і прадметы народнага побыту, вырабы майстроў-умельцаў і дакументы, зброю і фатаграфіі, чучалы і муляжы, кнігі, асабістыя справы знакамітых землякоў і інш.

Штогод музей прымае ўдзел у Міжнароднай акцыі "Ноч у музеі". 6 мая 2021 г. распачаў працу філіял музея "Гальшанскі замак".

Калектыў музея за час існавання ўзначальвалі А.М.Кушнераў (першы дырэктар), В.У.Свенціхоўскі, Л.Д.Яфімцава, М.Ф.Спірыдонаў, В.Р.Навумаў, Ю.Н.Борд (два апошнія – па сумяшчальніцтве), М.М.Бараноўскі, А.Р.Каранеўскі, Д.І.Васілеўская, Ж.І.Іванова, А.І.Жасткова (2019–2021), з 2013 г. – А.В.Навіцкая.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. К. Багушэвіча: Музеі раёна // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.646-647.*
*2. УК «Ошмянский краеведческий музей им. Ф. К. Богушевича». – Режим доступа: https://museum.kultoshm.by/*

## 105 гадоў
## Кілачыцкі Міхаіл Аляксандравіч (1920 – 1994)



Педагог, Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Нарадзіўся 30.10.1920 г. у в.Алешкаўка Лоеўскага раёна. Закончыў 3 курсы Гомельскага педінстытута (1946). У час Вялікай Айчыннай вайны курсант Тамбоўскага пяхотнага вучылішча, у канцы 1941 г. прымаў удзел у абароне Масквы. Пасля лячэння ў шпіталі дэмабілізаваны (1942). У 1942 – 1944 гг. у школах Краснаярскага краю: выкладчык, дырэктар. З 1944 г у Беларусі: выкладчык Бывалаўскай НСШ Лоеўскага раёна (1945), інспектар Ашмянскага райана (1946), выкладчык Ашмянскага педвучылішча (1946–1957), выкладчык беларускай мовы і літаратуры, завуч школы-інтэрната (1957–1984). Ганаровае званне “Заслужаны настаўнік Беларусі” прысвоена ў 1968 г. Дэлегат Усесаюзнага з’езда настаўнікаў (1968). Узнагароджаны медалямі “За доблесную працу”, “Ветэран працы”, значком “Выдатнік народнай асветы”.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Кілачыцкі Міхаіл Аляксандравіч: Заслужаны настаўнік: Вызначыліся працай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.562.*

# *Лістапад*

## 225 гадоў
## Ходзька Леанард (1800 – 1871)



Польскі гісторык, публіцыст, выдавец. Нарадзіўся 06.11.1800 г. у в.Аборак Маладзечанскага раёна. Са шляхты. Вучыўся ў Барунскай базыльянскай школе, у Віленскім універсітэце (1816–1817); належаў да філарэтаў. У 1819–1826 гг. сакратар М.К.Агінскага. З 1826 г. у Парыжы, актыўны дзеяч польскай эміграцыі, член многіх навуковых таварыстваў.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Ходзька Леанард: Іх шлях пралёг праз Ашмяншчыну // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.159.*

## 80 гадоў
## Шкуратаў Ігар Мікалаевіч (1945)



Беларускі мастак, мастацкі педагог. Член Беларускага саюза мастакоў (1993). Нарадзіўся 14.11.1945 г. у г.Ашмяны. З сям’і вайскоўца. Жылі пазней у Расіі (г.Тамбоў), дзе закончыў школу. Працаваў на будоўлі ў г.Электрасталь Маскоўскай вобласці. Служыў ў Савецкай арміі (1964–1967). Вучыўся на мастацка-графічным аддзяленні Тамбоўскага педагагічнага вучылішча. У 1976 г. закончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Працаваў ў мастацкіх майстэрнях Віцебска. З 1989 г. выкладае на кафедры малюнка і жывапісу Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава. У 1992–1993 гг. выкладаў акварэль у Заходнееўрапейскім інстытуце культуры ў Германіі. Працуе як жывапісец у жанрах пейзажа, нацюрморта,

партрэта, тэматычных кампазіцый. З 1990-х гадоў займаецца графікай. У выставах (Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі) удзельнічае з 1981 г. Аўтар серый "Па пушкінскіх мясцінах", "Кіжы", "Старасць", твораў "Лясная сімфонія", "Палявыя кветкі", "Адзіноцтва", "Поры года" і інш.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Художники Витебщины. – Режим доступа:* [http://painters.vlib.by/ru/component/content/article/150-portfolio/zhivopis-grafika/shkuratov-igor/333-biografiya-shkuratov](http://painters.vlib.by/ru/component/content/article/150-portfolio/zhivopis-grafika/shkuratov-igor/333-biografiya-shkuratov)

*2. Шкуратаў Ігар Мікалаевіч: Звязаны лёсам з Ашмяншчынай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.572-573.*

## 95 гадоў
## Саковіч Віктар Арсеньевіч (1930 – 2001)



Педагог, Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Нарадзіўся ў лістападзе 1930 г. у в.Княгінін Мядзельскага раёна. Закончыў Мінскі інстытут фізічнай культуры (1955). З 1955 г. у Ашмянах: выкладчык фізічнага выхавання СШ №1 (1955–1957), школы-інтэрната (1958–1969), дырэктар дзіцячай спартыўнай школы (1969–1972), настаўнік СШ №2 (1972–1982), Палянскай НСШ (1982–1992). Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1968).

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Саковіч Віктар Арсеньевіч: Вызначыліся працай // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Ашмянскага раёна / укладальнік А.Р.Каранеўскі, рэдкал.: Г.К.Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – С.563.*

## *Снежань*

## 225 гадоў
## Ходзька Іосіф Іванавіч (1800 – 1881)



Беларускі геадэзіст і тапограф, падарожнік. Генерал-лейтэнант. Нарадзіўся 18.12.1800 г. у в.Крывічы Вілейскага павета Мінскай губерні. Сын Яна Ходзькі. Родавы маёнтак Ходзькаўшчына Ашмянскага павета. Скончыў Віленскі ўніверсітэт (1821). З 1821 г. у рускай арміі, праводзіў тапаграфічныя і трыянгуляцыйныя работы ў Літве, Курляндыі, Беларусі, таксама ў Гродзенскай губерні. Удзельнік экспедыцыі В.Струвэ па градуснаму вымярэнню дугі мерыдыяна (вядомага як Дуга Струвэ, адзін з пунктаў якой знаходзіцца на Ашмяншчыне – пункт Тупішкі). Склаў першую карту Каўказскіх гор. У час Крымскай вайны 1853–1856 гг. прызначаны ў геадэзічны аддзел рускай арміі ў Турцыі, праводзіў тапаграфічныя работы ў раёне Карса і Эрзерума. Навуковыя працы друкаваў на рускай, французскай і нямецкай мовах. Узнагароджаны Канстанцінаўскім медалём Расійскага геаграфічнага таварыства, яго ганаровы член. Каўказскі філіял РГТ у Тыфлісе зацвердзіў прэмію імя І.Ходзькі за лепшую геаграфічную працу па каўказскай тэматыцы. Памёр у Тыфлісе ў 1881 г.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Самый необычный объект в Беларуси, который особо ценится ЮНЕСКО: Дуга Струве. – Режим доступа: https://tochka.by/articles/turizm/samyy_neobychnyy_obekt_v_belarusi_kotoryy_osobo_tsenitsya_yunesko/*

*2. Ходзько, Иосиф Иванович. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A5%D0%BE%D0%B4%D0%B7%D1%8C%D0%BA%D0%BE,_%D0%98%D0%BE%D1%81%D0%B8%D1%84_%D0%98%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D0%B8%D1%87*

## 75 гадоў
## Праўко  Мікалай Мікалаевіч (1950)



Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (2018), старшыня камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства (КСУП) “Гальшаны”, Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2013). Нарадзіўся 23.12.1950 г. у в.Некрашы  Гродзенскага раёна. Закончыў Ашмянскі сельскагаспадарчы тэхнікум, Гродзенскі Дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Працаваў у сельгаспрадпрыемствах Гродзеншчыны. З 1983 г. у Ашмянскім раёне, старшыня калгаса імя Леніна, з 2016 г. – кіраўнік дзяржсельгаспрадпрыемства “Гальшаны” (да снежня 2022 г.).

За шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, асабісты ўклад у развіццё аграпрамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь удастоены медаля “За працоўныя заслугі”. Узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, медалём Беларускай Праваслаўнай царквы Свяціцеля Кірылы Тураўскага. Занесены ў кнігу Гонару Гродзенскай вобласці. Званне “Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны” прысвоена рашэннем Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў № 146 ад 25.06.2013 г. за дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў і шматгадовую добрасумленную працу ў сельскагаспадарчай галіне Ашмянскага раёна.

*Крыніцы інфармацыі:*

*1. Правда жизни по Николаю Правко. За счет чего из отстающего хозяйства ему удалось создать успешное сельхозпредприятие в Ошмянском районе. – Режим доступа:* https://www.osh.by/?p=49040
*2. Праўко  Мікалай Мікалаевіч: Почетные граждане. – Рэжым доступу:* https://www.oshmiany.gov.by/ru/pochetnye-grajdane-ru/

Складальнік: Г.У. Палубінская

Адказны за выпуск: М.Р.Белавус